

*Валянцін СЕМЯНЯКА*

# *НА ЖЫЦЦЁВЫХ СЦЕЖКАХ-ПУЦЯВІНАХ*

## На досвітку

На досвітку прырода спіць,
І цішыня стаіць такая,
Што чуеш, як раса дрыжыць
І кропля долу ападае.
Лес трызніць сонечным цяплом,
А неба – ранішнім блакітам,
Усё наўкол салодкім сном,
Нібыта посцілкай, спавіта.
Бясконцы велічны прастор
Над сумнай безданню лунае,
Глядзіцца ў бязмежжа зор
Ракі паверхня люстраная.
Нямыя постаці дубоў
Застылі ў роспачным чаканні,
Сівыя дні былых гадоў,
Напэўна, мрояцца ім ўранні.
...Павее лёгкі вецярок,
Абудзіць птушак гаварлівых,
І зробіць самы першы крок
Насустрач сонцу дзень імклівы.

*16.11.1996*



# На малой радзіме

*Уладзіміру Мазго*

Хуценькі аўтобус па шашы імчыцца.
Папрашу кіроўцу ў Зэльве прыпыніць:
"Дай мне, браце, выйсці, тут мая сталіца,
Дай ізноў на сэрцы раны загаіць.
Дай мне наталіцца водарам духмяным
Залатых палеткаў, кветкавых лугоў,
Дай мне не забыцца, як гучаць на ранні
Над малой радзімай песні жаўрукоў."
Я хачу прыпомніць кожную драбніцу,
Што хавае памяць з колішніх гадоў.
Каб затым напоўніць, бы каўшом з крыніцы
Песнямі сваімі кут маіх дзядоў.
Тут знайду я сілы для штодзённай працы,
Тут змагу нарэшце адпачыць душой.
Каб затым у думках зноў і зноў вяртацца
У святыя месцы раніцы маёй.
Тут, здаецца, болей і цяпла, і сонца.
Тут травінцы кожнай адаб'ю паклон.
Толькі тут шчаслівым быць магу бясконца,
Толькі тут на яве ажывае сон.
Знаю – час не спыніш, скончыцца сустрэча,
І вялікі горад пазаве ізноў.
Зэльва, ты заўсёды для мяне дарэчы!
Ты – мая радзіма, ты – мая любоў!

*10.04.2014*

## На скрыжаванні

*М. І. Адаміну*

На скрыжаванні думак і шляхоў,
Амбіцый, лёсаў і веравызнанняў
Так цяжка не звярнуць у свет грахоў,
У свет спакусы і расчаравання.
Не страціць, не прадаць бясцэнны скарб,
Які табе пакінуў продак дбайны,
І велічна пакласці на алтар
Ўсё тое, што ты сам здабыў змаганнем.

Калі навокал столькі ўсяго –
Даступнага і простага – чужога,
Так цяжка не адмовіцца свайго –
Імя, Радзімы, Мовы, нават Бога.
Бо, несучы свой гэты крыж цяжкі,
Зазнаеш ты і гора, і нястачу –
Усё, што нёс народ твой праз вякі,
І нават тое, што ніхто не бачыў.

Не проста гэта, што і гаварыць!
Складана вельмі зберагчы святое.
Складаней нат, чым новае стварыць,
Бо новае – забытае старое!
Але так лёгка крочыць па жыцці,
Змагацца, верыць і любіць аддана,
Калі шлях, па якім рашыў ісці,
Ты правільна абраў на скрыжаванні!

*2002*

***

*Маім аднакласнікам –*
*выпускнікам Цяглевіцкай*
*сярэдняй школы 1980 года.*

Нам трэба некалі вяртацца
Да першых сцежак і пачуццяў,
Да песень, што спявала маці,
Да слоў, што вечнымі завуцца.
Да ніваў тых, да тых абшараў,
Якія шлях у свет давалі,
Да мілых сэрцаў, родных твараў,
Якія ў сцюжу сагравалі.

Нам трэба некалі вяртацца,
Няхай у кут жыццё загнала.
Каб адпачыць і сіл набрацца
І  на нагах стаяць трывала.
Каб у вірлівым зорападзе
Сваіх вытокаў не забыцца,
І ў смуглівым даляглядзе
Сябе не страціць, не згубіцца.

Нам трэба некалі вяртацца,
Няхай складаны лёс не песціць,
Каб з большым горам не спазнацца,
Якое зноў чакае дзесьці.
Хто знае, што яшчэ там будзе?
Які аракул тое скажа?
І толькі самым блізкім людзям
Патрэбны смех і слёзы нашы.

Нам трэба некалі вяртацца,
Бо ўсё ў мінулым застаецца –
Удача, грошы, нават шчасце
Калісьці ўсё-такі мінецца.
І ты захочаш усміхнуцца
Матулі, вёсцы, кожнай хаце.
Дык, калі ёсць куды вярнуцца –
Ўсё ж трэба некалі вяртацца.

*2005*

## Песні Зэльвеншчыны

Якім ні быў цяжкім наш час,
Ды толькі песні не знікаюць.
Яны надзеяй поўняць нас,
Яны пачуцці абуджаюць.

У Тулаве і Манцяках
Гучаць мелодыі чароўна
Аб тым, што выжыве ў вяках
Любоў да Бацькаўшчыны роднай.

Аб прыгажосці нашых рэк,
Азёр, лясоў і ніў зялёных,
Аб тым, што любіць чалавек,
І што хвалюе яго сёння.

Усё ў тых песнях – радасць, сум
І колер чэрвеньскай вясёлкі,
Пах першых кветак, ветру шум,
Кахання лёс такі нялёгкі.

Ізноў узнёслы іх палёт
Напеўнай шчырасцю здзіўляе.
Спявае песні мой народ –
Жыве душа яго святая!

*1997*

## У храм



На жыццёвых сцежках-пуцявінах
Шмат чаго прыходзіцца сустрэць.
І за ўсё мы Госпаду павінны,
І за ўсё ўдзячны, насамрэч!
Боль і радасць, поспех і няўдачу
Ён не пасылае нездарма –
На карысць і грошы, і нястача,
На карысць  і лета, і зіма.
А калі даб'юць выпрабаванні,
Раздзяліўшы душу папалам,
Каб не ўпасці ў грэх расчаравання,
Я прыду ў Сынкавічы – у храм.
Тут знайду ратунак ад паразы,
Хворую тут палячу душу,
Тут пачую важныя адказы,
А на штосьці сам тут адкажу.
Пастаю сярод магутных сценаў,
Памаўчу, паплакаўшы ў цішы,
Упаду з малітвай на калені –
Паклянуся болей не грашыць.
І, адчуўшы зноў у сэрцы радасць,
Вытру з твару горкую слязу.
Ласку Бога і Яго спагаду
З лёгкасцю па свеце панясу.

*16.09.2017*

## Церахавічы

Між лугоў квяцістых рэчачка бруіцца,
Побач з ёю – сцежка ў мурагах густых.
А за рэчкай – вёска, краявід дзяцінства.
Тут Церахавічы – край дзядоў маіх.

На крутых пагорках – хаты-маляванкі,
У садах вяргіні гнуцца пад расой,
І вітае бусел клёкатам з буслянкі,
І падворак кожны дыхае красой.

Буду, як заўсёды, я ісці няшпарка,
Ды мяне прызнаюць хутка за свайго,
Будзе стол накрыты, з’явіцца і чарка,
І да чаркі, пэўна, шмат яшчэ чаго.

Бы вада ў рачулцы, паплыве гаворка,
Аб навінах свежых і часах былых.
Будзе рэй вясціся, ціха, нетаропка,
Так заўжды бывае гэта між старых.

А як сонны вечар ахіне даліну
І загляне з неба ў студні маладзік,
Дружным хорам песню завядзе радзіна
Аб шчаслівай долі ніваў залатых.

...Адзвінелі песні, адцвілі вяргіні.
Паз’язджалі ў горад дочкі і сыны.
А бабулькам грэюць сэрца прыпаміны,
Ды яшчэ чаканне новае вясны.

*2008*

## Цяглевічы

Я прыеду ў Цяглевічы ранкам вясновым,
На парозе бацькоўскае хаты спынюся.
Апякуць, нібы дзіда, балючыя словы:
“Ты праездам ізноў, ці, нарэшце, вярнуўся?”

Што мне ім адказаць – гэтым сценам амшэлым,
Гэтым вокнам, якія мне сонца давалі?
Што сказаць гэтым грушам і слівам здзічэлым,
Каб нарэшце за здраду мяне даравалі?

Што дарма гаварыць, як на розных сцяжынах
Гэты ціхі куточак заўжды ўспамінаю!
Як у цяжкія дні вылучаю хвіліну,
Каб узнесці малітву за моц свайго краю!

Як нясу праз гады памяць продкаў памерлых
І падзяку ўсяму, што так дарага сэрцу!
Не, няма такіх слоў, і ніякія “перлы”
Не памогуць маё шкадаванне данесці.

Тут цяпер цішыня, тут шчыруе прырода,
Буйным колерам краскі рассыпаны ў садзе,
Толькі птушкі часамі пяюць пры нагодзе
Ды гуллівыя пчолы свой ранішнік ладзяць.

Тут няма для мяне ўжо ніякага месца,
Тут ніхто, як калісьці, мяне не чакае.
Толькі кожная зёлка з надзеяй, здаецца,
Як на роднага, зноў на мяне паглядае.

*20.04.2017*

